Акадэмія паслядыпломнай адукацыі

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ «АД ЛАКАЛЬНЫХ ПРАЕКТАЎ – ДА МАСАВАЙ ПРАКТЫКІ»

НАРОДНАЯ Асвета

# ВЫВУЧЭННЕ І ЗАХАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРАЗ ЭТНАКУЛЬТУРНУЮ АДУКАЦЫЮ

## Рэалізацыя інавацыйнага праекта па ўкараненні этнакультурных тэхналогій для пашырэння і ўзбагачэння адукацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі



**А. М. Міхалёнак,**
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
Ільянскай СШ імя А. А. Грымаця

Сістэматызацыя эфектыўнага вопыту педагогаў па папулярызацыі сярод навучэнцаў роднай мовы і выхаванні беларускамоўнай асобы лягла ў аснову рэалізацыі на базе нашай школы інавацыйнага праекта **«Укараненне этнакультурных тэхналогій для пашырэння і ўзбагачэння адукацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі»** (2018–2022 гг.). Праект меў на мэце фарміраванне ў вучняў гатоўнасці да ўмацавання культурнай і гістарычнай ідэнтычнасці беларускага народа, а таксама захавання, развіцця, распаўсюджвання і папулярызацыі беларускай нацыянальнай гісторыі, культуры і мовы.

Інавацыйная дзейнасць ажыццяўлялася праз арганізацыю работы клубаў «Цікавыя сустрэчы» і «Юныя экскурсаводы» (існуюць на базе школьных народных музеяў «Ільянскія далягляды» і «Вілейшчына літаратурная»), прэс-цэнтра школы, заняткаў па інтарэсах «Пейзажны свет беларускай паэзіі», «Асновы праваслаўнай культуры», «У свеце колеру» і факультатыўных заняткаў па беларускай мове і літаратуры ў 1–11 класах. Удзельнікі праекта вывучалі рэлігійныя прадстаўленні народа, асаблівасці беларускіх свят, звычаяў, абрадаў, рытуалаў, засвойвалі элементы нацыянальнай сімволікі і нацыянальнага касцюма, знаёміліся са стравамі беларускай кухні, даследавалі творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вынікі працы сістэматычна адлюстроўваліся на старонцы «Інавацыйны праект» інтэрнэт-сайта нашай установы (https://ilya.vileyka-edu.gov.by/реализация-проектов/інавацыйны-праект), у школьнай газеце «Ільянскія далягляды», на школьным канале youtube.com (https://www.youtube.com/channel/UCL8jHa2FSTMTi5R7E-r597w). Прадуктамі праекта сталі дыдактычныя матэрыялы па тэме «Гадавое кола свят», распрацоўкі інтэрактыўнай гульні «Размаўляем па-беларуску» для вучняў 1–11 класаў і гульні-размалёўкі «Элементы нацыянальнага арнаменту» для вучняў 1–4 класаў, інтэрактыўная літаратурная карта «Нам засталася спадчына», беларускамоўны зборнік відэаролікаў культуралагічнай тэматыкі.

Сёння педагогі Ільянскай СШ імя А. А. Грымаця на старонках часопіса «Народная асвета» дзеляцца эфектыўным інавацыйным вопытам і прадстаўляюць аўтарскія матэрыялы, якія будуць карысны настаўнікам для арганізацыі пазакласных мерапрыемстваў.



# Прафесійная пераклічка

## Інтэрактыўная гульня «Размаўляем па-беларуску»



**А. С. Гаўрылік,**
настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі
Ільянскай СШ імя А. А. Грымаця

У рамках рэалізацыі інавацыйнага праекта ў нашай школе была праведзена серыя **інтэрактыўных гульняў «Размаўляем па-беларуску»** для вучняў 2–4 класаў. Гульні распрацаваны з улікам узроставых асаблівасцей дзяцей, а выкарыстанне займальнага матэрыялу накіравана на паглыбленне ведаў малодшых школьнікаў па беларускай мове і літаратуры, развіццё маўлення, памяці і мыслення, выхаванне павагі да роднай культуры. Прапануем вашай увазе адно з мерапрыемстваў, прысвечанае Міжнароднаму дню роднай мовы.

**Мэты гульні:** фарміраванне ў дзяцей беларускамоўнага слоўнікавага запасу, развіццё пазнавальнага інтарэсу, выхаванне нацыянальнай самасвядомасці, патрыятызму і любові да Радзімы.

**Ход гульні**

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

**Настаўнік.** 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Якая мова з'яўляецца для нас роднай? *(Адказы дзяцей.)* Мова – найважнейшы складнік чалавечай культуры, гістарычнай спадчыны народа, дзякуючы ёй нацыянальныя традыцыі працягваюць жыць і развівацца. Мова абуджае цікавасць чалавека да пазнання свету, дапамагае даведацца аб мінулым сваёй краіны.

*Настаўнік прапануе вучням падзяліцца на дзве каманды і прыдумаць ім назвы, а затым абвяшчае* ***правілы гульні:*** *1) усе размаўляюць па-беларуску; 2) абмяркоўвае пытанне ўся каманда, адказвае адзін чалавек; 3) капітан прадстаўляе ўдзельніка, які будзе адказваць, або адказвае сам.*

**ІІ. Асноўны этап**

**Конкурс «Адгадай загадкі».** Камандам па чарзе прапануюцца загадкі. За кожны правільны адказ даецца 1 бал.

1. Круглы, як сонца, гарыць пад ім донца.
Зарумянены бачок – шух на ручнічок! *(Блін.)*
2. Напіўся, наеўся – на агонь усеўся,
Кашу зварыў і нас накарміў. *(Гаршчок.)*
3. З ялінкі на ялінку, з галінкі на галінку
Скача агеньчык жывы...
Хто гэта? Ці ведаеце вы? *(Вавёрка.)*
4. Мышак ловіць, ды не коцік ён,
І лісты носіць, ды не паштальён.
Каб лісе не трапіць на зубок,
У калючы скруціцца клубок. *(Вожык.)*
5. Урадзіўся ён высокі, шаўкавісты, сінявокі.
Апранае нас здавён... Здагадайцеся – гэта... *(Лён.)*
6. Цвіту ўсё лета я, жыву звычайна ў жыце.
Нашу хлапечае імя. Як зваць мяне, скажыце? *(Васілёк.)*

**Конкурс «Перакладчыкі».** Каманды атрымліваюць карткі са словамі, якія трэба

перакласці з рускай мовы на беларускую. За кожны правільны адказ – 1 бал, яшчэ бал дабаўляецца камандзе, якая першай выканала заданне.

***Словы:*** художник (*мастак*), кукла (*лялька*), улыбка (*усмешка*), кукушка (*зязюля*), силач (*асілак*), ветка (*галіна*), кувшин (*збан*), лицо (*твар*).

**Конкурс «Назаві адным словам».** Камандам неабходна падабраць да прапанаваных груп слоў абагульняючае паняцце. За кожны правільны адказ прысуджаецца 1 бал.

***Каманда 1:*** званочак, рамонак, васілёк *(кветкі)*; верабей, ластаўка, сарока *(птушкі)*; заяц, воўк, мядзведзь *(звяры)*; чаравікі, боты, туфлі *(абутак)*; агурок, фасоля, морква *(агародніна)*.

***Каманда 2:*** ліпа, дуб, клён *(дрэвы)*; яблык, груша, сліва *(садавіна)*; стол, шафа, ложак *(мэбля)*; сукенка, спадніца, футра *(адзенне)*; пчала, жук, чмель *(насякомыя)*.

**Конкурс «Наадварот».** Прадстаўнікі каманд даюць азначэнне паняцця *антонімы*, а затым атрымліваюць карткі, з якіх трэба сабраць пары. Перамагае каманда, што першай дала правільныя адказы.

***Каманда 1:*** зіма – (*лета*), высока – (*нізка*), мяккі – (*цвёрды*), ідзе – (*стаіць*).

***Каманда 2:*** ранак – (*вечар*), цяжка – (*лёгка*), шырокі – (*вузкі*), весяліцца – (*сумаваць*).

**Конкурс для балельшчыкаў.** Балельшчыкі павінны завучыць і прагаварыць адну са скорагаворак: «Белы бусел баіў байку беламу зайку» або «Мілая мама мыла мылам малую Мілу». Ацэньваецца хуткасць і правільнасць – сваёй камандзе можна прынесці 1 бал.

**Конкурс «Метаграмы».** За кожную разгаданую метаграму камандам прысуджаецца 1 бал.

1. З «м» расту я на градзе.
З «р» я поўзаю ў вадзе. *(Мак – рак.)*
2. Я маю сцены і куты,
Усё жыццё служу табе.
Мне «о» на «ы» заменіш ты –
Тады шукай мяне ў трубе. *(Дом – дым.)*
3. Калі на «д» – паверхі маю.
Калі на «л» – дзяўбу, ламаю. *(Дом – лом.)*
4. У лесе з «б» мяне шукаеш
І з прыемнасцю зразаеш.
Калі «б» на «п» заменіш,
Сцеражыся: захварэеш! *(Грыб – грып.)*

**Конкурс «Дамашняе заданне».** Удзельнікі каманд чытаюць на памяць загадзя падрыхтаваныя вершы на беларускай мове. Выкананне ацэньваецца ў 1–5 балаў.

**III. Заключны этап**

Падводзяцца вынікі гульні: падлічваюцца балы, якія зарабілі прадстаўнікі кожнай каманды, узнагароджваюцца пераможцы. Настаўнік чытае верш Юрася Свіркі «Хацеў бы я...».



**С. Р. Філістовіч,**
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі Ільянскай СШ імя А. А. Грымаця

## ВЫРАЗНАЕ ЧЫТАННЕ – КАМПАНЕНТ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ

Паўнацэннае авалоданне навыкамі выразнага чытання з'яўляецца важнейшай умовай паспяховага навучання дзяцей у школе па ўсіх прадметах. У рамках рэалізацыі інавацыйнага праекта на факультатыўных занятках па беларускай мове і літаратуры мы працавалі над развіццём у навучэнцаў моўнага кампаненту этнакультурнай кампетэнцыі. Азнаямленне з беларускім фальклорам, лепшымі ўзорамі нацыянальнай дзіцячай літаратуры, побытам і рамёствамі продкаў садзейнічае фарміраванню ў малодшых школьнікаў нацыянальнага светапогляду. На прыкладах беларускамоўных тэкстаў вучні засвойвалі правілы раўнамернага размеркавання дыхання падчас чытання, правільную артыкуляцыю кожнага гука, асаблівасці захавання норм літаратурнага маўлення і лагічнага націску (матэрыялы прадстаўлены на сайце часопіса www.n-asveta.by).

# Заняткі па інтарэсах «Малюем беларускі арнамент»



**Т. П. Максімовіч,**
настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі
Ільянскай СШ імя А. А. Грымаця

У працэсе інавацыйнай дзейнасці мы шмат увагі надавалі эстэтычнаму выхаванню дзяцей падчас правядзення заняткаў па інтарэсах. З гэтай мэтай для навучэнцаў 1–4 класаў намі створана гульня-размалёўка «Элементы нацыянальнага арнаменту», на кожнай старонцы якой размешчаны фрагмент нацыянальнага арнаменту, подпіс і малюнак да яго. На асобнай старонцы прапануецца размалёўка, дзе можна выкарыстаць пячатку гэтага ці іншага элемента, а таксама схема яго паэтапнага малявання. Дадзеную гульню-размалёўку можна выкарыстоўваць у пазаўрочнай рабоце, на факультатыўных занятках адпаведнай накіраванасці, на ўроках выяўленчага мастацтва і працоўнага навучання (з матэрыяламі гульні-размалёўкі можна пазнаёміцца па QR-кодзе).

У якасці прыкладу заняткаў па інтарэсах «У свеце колеру» прапануем **тэму «Малюем беларускі арнамент».**

**Мэты**: стварэнне ўмоў для знаёмства навучэнцаў з беларускім арнаментам і яго элементамі, развіццё ў дзяцей уменняў здабываць веды з розных крыніц і выкарыстоўваць іх ва ўласнай дзейнасці, выхаванне павагі да культурных здабыткаў свайго народа, пачуцця патрыятызму, эстэтычнага густу.

**Абсталяванне:** гульня-размалёўка «Элементы нацыянальнага арнаменту», пячаткі сімвалаў беларускага арнаменту, схемы паэтапнага малявання элементаў.

**Ход заняткаў**

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Дзеці слухаюць народную песню «Я каўнер вышывала». Настаўнік прапануе вучням паразважаць, аб чым гэта песня, і выказаць свае меркаванні наконт мэты заняткаў.

**II. Аперацыйна-дзейнасны этап**

**Настаўнік.** Ромбы, квадраты, многавугольнікі, крыжы ў арнаменце – гэта не проста геаметрычныя фігуры, а своеасаблівая азбука, элементы якой, нібыта літары, могуць утвараць словы, выразы, сказы і такім чынам перадаваць пачуцці. Гэта знакавыя лісты ад нашых продкаў: паперу замяняе палатно, а чарніла – нітка. Усё, што бачыла жанчына ў жыцці, што рабіла, як весялілася, кахала, выходзіла замуж, стварала сям'ю, вяла гаспадарку, пра што марыла, з якімі просьбамі звярталася да Бога, яна расказвала праз свае работы, нібы сапраўдны кампазітар ці пісьменнік. Калі ўважліва прыгледзецца да чароўных узораў, то ў іх шмат чаго можна «прачытаць».

У беларускім арнаменце самыя распаўсюджаныя знакі, якія сімвалізуюць агонь, жыццё, сонца, – гэта круг, крыж, ромб (святло, што разыходзіцца на ўсе чатыры бакі), круг з крыжам, кола з шасцю спіцамі, што з цягам часу ператварыліся ў шматлікія варыянты зорачак. Галоўнай крыніцай існавання людзей на зямлі доўгі час былі жывёлагадоўля і земляробства, таму іх адлюстраванне – сімвал багацця і дабрабыту. Мы знойдзем у арнаменце вобразы Жыценя, Спарыша, Рая, Багача, Палевіка, Вялікага Сонца, Зямлі-карміцелькі і, канешне, хлеба як сімвалу дастатку і дабрабыту. Адлюстраваны і вобразы роднай Беларусі: звычайна гэта ўзор, скампанаваны з квадратаў і кругоў, што сімвалізавала сонца і зямлю. Можна сустрэць матывы ракі (папярэчныя палосы, якія нагадваюць рабізну на вадзе), вады (быццам кругі на вадзе, але складзеныя з прамавугольных кірпічыкаў), лесу, дубровы (звычайна некалькі радоў матываў магутных дрэў), поля, лугу (кветкі ўсіх магчымых колераў), жывёл, птушак.

*Настаўнік прапануе вучням разгледзець сімвалы «Сонца» і «Парасткі» і вызначыць, дзе можна сустрэць беларускі арнамент.*

*Сімвал «Сонца»* *Сімвал «Парасткі»*





**Настаўнік.** Беларускім арнаментам аздабляюць абрусы, сурвэткі, ручнікі. Ручнікі ткалі на кроснах з ільняных або баваўняных нітак, упрыгожвалі вышыўкай, вязанымі і пляцёнымі карункамі, махрамі. У кожнай сялянскай хаце спрадвеку захоўвалася вялікая колькасць ручнікоў, на якіх што ні ўзор, то сімвал дабра, праўды, прыгажосці, любові да чалавека і яго працы.

*Педагог дэманструе малюнкі разнастайных беларускіх сімвалаў на старонках гульні-размалёўкі «Элементы нацыянальнага арнаменту» і дае каментарыі. Дзеці выконваюць* ***практычную работу.***

**Этапы работы**

1. З дапамогай гульні-размалёўкі падбіраюцца ўзоры для ручнікоў, сурвэтак, адзення.
2. Выбраныя элементы арнаменту пры дапамозе пячатак і фарбаў наносяцца спачатку на аркушы паперы.

***Прыклады пячатак***




3. На аснове схем паэтапнага малявання з дапамогай алоўка ствараецца прапанаваны элемент.




4. Арганізуецца праца з размалёўкай: абраныя элементы арнаменту наносяцца на малюнак прадмета.


Фартух

**III. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія**

Кожны навучэнец дэманструе свае малюнкі, тлумачыць, чаму ён выбраў той ці іншы элемент арнаменту. Арганізуецца выстава работ.



**А. А. Шушкевіч,**
кіраўнік народнага музея «Вілейшчына літаратурная», настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі Ільянскай СШ імя А. А. Грымаця

## ІНТЭРАКТЫЎНАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ КАРТА «НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА»

У нашай школе стала традыцыяй, што перад вывучэннем творчасці пісьменнікаў і паэтаў, жыццёвы шлях якіх звязаны з Вілейскім раёнам і Ільяншчынай, вучні наведваюць музей «Вілейшчына літаратурная». Такія ўрокі праходзяць з выкарыстаннем музейных фондаў і садзейнічаюць павышэнню ў дзяцей матывацыі да вывучэння беларускай літаратуры. Вынікам працы актыву музея над рэалізацыяй інавацыйнага праекта стала сістэматызацыя музейных матэрыялаў і стварэнне інтэрактыўнай літаратурнай карты «Нам засталася спадчына». Дадзены прадукт можна прымяняць як на ўроках, так і ў пазакласнай дзейнасці пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў у рамках прадметных тыдняў, школьных і раённых конкурсаў даследчых работ, прэзентацый, а таксама на класных гадзінах (матэрыялы прадстаўлены на сайце часопіса www.n-asveta.by).

# «Гадавое кола свят»: лэпбук як форма прадстаўлення матэрыялаў



**З. А. Кіпель,**
настаўнік хіміі вышэйшай катэгорыі
Ільянскай СШ імя А. А. Грымаця

Адной з задач, якую давялося рашаць настаўнікам нашай школы ў ходзе рэалізацыі інавацыйнага праекта, было знаёмства навучэнцаў з праваслаўнымі святамі, імёнамі і жыццёвымі подзвігамі святых, традыцыямі беларускага народа. Вялікі аб'ём інфармацыі, атрыманай з розных крыніц (літаратуры, электронных рэсурсаў, гутарак са святарамі і аднавяскоўцамі), неабходна было данесці да дзяцей у цікавай форме – так і ўзнікла ідэя афармлення друкаванага і электроннага варыянтаў лэпбука.

Зыходзячы з таго, што лэпбук – гэта не проста кніжка з малюнкамі, а своеасаблівы вучэбны дапаможнік, мы прадумалі, якія старонкі ён павінен уключаць, каб раскрыць сутнасць дванадзясятых свят, і як ён можа выкарыстоўвацца ў вучэбнай і пазавучэбнай дзейнасці.



Прапануем прыкладны **алгарытм прымянення лэпбука «Гадавое кола свят»** пры правядзенні заняткаў.

*Вывучэнне гісторыі свята.* Назва і дата святкавання, ікона, кароткае апісанне падзей, якія ўпамінаюцца ў Евангеллі, – усе гэтыя звесткі змешчаны на левай старонцы. Дзяцей малодшых класаў з імі звычайна знаёміць настаўнік, а старшыя вучні могуць прачытаць тэкст самі.

*Знаёмства з тэорыяй.* Трапары, кандакі і ўрачыстыя гімны, складзеныя аўтарамі хрысціянскіх песень, мы змясцілі на правай старонцы ўверсе. У кішэні лэпбука ёсць іх азначэнні, тэксты на рускай і беларускай мовах, указаны тоны, згодна з якімі яны спяваюцца.

*Знаёмства з іканаграфіяй і архітэктурай.* Невялікія надрукаваныя копіі ікон і фотаздымкі храмаў, пабудаваных у гонар святога ці евангельскай падзеі, размешчаны ў сярэдняй кішэні лэпбука – іх можна раздаць дзецям, папрасіць уважліва разгледзець і, пакуль настаўнік чытае тэкст, знайсці тыя элементы, аб якіх паведамляецца.

*Арганізацыя кантролю ведаў.* У ніжняй кішэні лэпбука знаходзяцца карткі з пытаннямі віктарын па тэмах, што вывучаюцца.

Матэрыяламі лэпбука можна карыстацца пры правядзенні заняткаў па інтарэсах па праграме факультатыва «Асновы праваслаўнай культуры», інфармацыйных і класных гадзін на тэмы праваслаўных свят і традыцый беларусаў, гісторыі малой радзімы, краязнаўства, а таксама на ўроках па прадмеце «Мастацтва (сусветная і айчынная мастацкая культура)».

## ЛІТАРАТУРА

1. **Афанасьева, А. Б.** Этнокультурное образование: сущность, структура содержания, проблемы совершенствования / А. Б. Афанасьева // Проблемы педагогики и психологии. – 2009. – № 3. – С. 189–195.
2. **Болбас, В. С.** Мадэль этнакультурнага выхавання: мэты, задачы, змест, прынцыпы і формы / В. С. Болбас // Народная асвета. – 2010. – № 1. – С. 76–80.
3. **Калачова, І. І.** Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына народаў Беларусі / І. І. Калачова. – Мінск: НІА, 1999. – 179 с.